ЧЫРВОНАЕ ЛЕТА — ЗЯЛЁНЫ ПАКОС

Па гарызанталі: 1. «... ідуць, звіняць іх косы, // Вітаюць іх буйныя росы». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Летнім часам»). **6.** Лекавыя травы, а таксама настой на іх. **8.** «... — з ягаднаю парой». З верша П. Панчанкі «Родная мова». **9.** «Стары заяц ... косіць, // А ліса зграбае». З прыпеўкі. **10.** Тое, што і штабель. **12.** «... сонца». Такую назву ў народзе далі дзьмухаўцам за іхнія прыгожыя ярка-жоўтыя кветкі ў перыяд цвіцення. **15.** Дасканалы ўзор чаго-небудзь. **16.** Трава, што вырасла ў той жа год на месцы скошанай. **17.** На Тодара (21 чэрвеня) ... — канапель паласа (прык.). **18.** У чэрвені ... з зарою сходзяцца (прык.). **21.** ... сноп ці сто коп — хлеба на год (прык.). **22.** «Ой, суніцы чырвоныя, // Чабаровы ...». З верша В. Леанені «Ой, суніцы чырвоныя». **27.** Спецыяліст па кветкаводстве. **29.** Беларуская багіня лета. **30.** «І тут найсаладзейшыя суніцы, // І тут найлагаднейшая ...». З верша С. Валодзькі «Бацькоўскі кут». **31.** Тое, што і цемната (разм.). **32.** «Хацелася туды прыспешыць крок, // Дзе на прыпёку першыя суніцы // Паказваюць ружовенькі ...». З верша С. Законнікава «Суніцы». **33.** Раніцай ... пахне мацней звычайнага — да дажджу (прыкм.).

Па вертыкалі: 1. Час касьбы. **2.** Сіні колер. **3.** ... весяліцца, і твар цвіце (прык.). **4.** Вадзяны вал. **5.** Старажытнарымская багіня, ад імя якой утварылася руская назва месяца чэрвеня — іюнь. **7.** Чырвонае ... — зялёны пакос (прык.). **11.** Чэрвень — ..., ураджай мужыку запасае (прык.). **13.** Ранні баравік, які вырастае ў час каласавання жыта. **14.** Старадрукаваныя кнігі. **19.** Зарадзіў ... — хлебу канец (прык.). **20.** Від мясцовасці з вышыні. **23.** Калі ў першы і другі дзень чэрвеня лье дождж — увесь ... будзе сухі (прык.). **24.** Тое, што і абраз. **25.** У чэрвеня ... ў бары: цвітуць сасна і елка (прык.). **26.** Рака, левы прыток Прыпяці **28.** «Ой, ... на Івана. // Проці Івана ночка мала, // Ой, ... на Івана». З купальскай песні.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Касцыр. 6. Зёлкі. 8. Чэрвень. 9. Сена. 10. Стос. 12. Пацалунак. 15. Дзян. 16. Атава. 17. Рса. 18. Зара. 21. Аўзін. 22. Тумаи. 27. Кветкавод. 29. Цёцір. 30. Рака. 31. Цямнота. 32. Баюк. 33. Трава. **Па вертыкалі:** 1. Касавіца. 2. Сіні. 3. Сцуда. 4. Хвала. 5. Конна. 7. Лета. 11. Скнара. 13. Каласавік. 14. Старадрук. 19. Звяней. 20. Панарама. 23. Месяц. 24. Ікона. 25. Свята. 26. Піўн. 28. Рана.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.39	21.38	16.59
Віцебск —	4.21	21.36	17.15
Магілёў —	4.29	21.28	16.59
Гомель —	4.35	21.16	16.41
Гродна —	4.56	21.52	16.56
Брэст —	5.06	21.43	16.37

Месяц

Апошняя квадра 6 чэрвеня.

Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Алены, Аверкія, Георгія, Івана, Карпа, Макара.*

К. *СЭРЦА ХРЫСТА. Ады, Ядвігі, Вільгельма, Максіма, Медарда, Севярына.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Муж кінуў піць — наш сабака застаўся без суразмоўцы.

У бары.

— Вам што падаць да піва?

— Фінал ЧС па футболе.

Ведайце, што нованароджаны з акна дзясятага паверха радзільнага аддзялення не падобны ні на тату, ні на маму — ён падобны на фасолю.

Аб'ява ў дэканаце:

«Студэнты, якія маюць «хвасты», будуць павешаны на другім паверсе».

Дырэктар кажа драматургу:

— Публіцы не падабаецца ваша п'еса.

— Адкуль вы ведаеце, зала ж пустая.

Калі вам няма чаго рабіць, то рабіце гэта на рабоце, каб не бясплатна.

Даты Падзеі Людзі

8 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1895 год — нарадзіўся (вёска Погіры, цяпер у Дзятлаўскім раёне) Ігнат Сямёнавіч Дварчанін, беларускі літаратуразнавец, паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. З 1919 года вёў культурна-асветніцкую работу ў Дзятлаўскім павеце, у Даўгаўпілсе (Латвія). З 1926 года — у Вільні на выкладчыцкай рабоце. У 1928—1930 гадах быў адным з кіраўнікоў Таварыства беларускай школы. У 1928-м абраны паслом у Польскі сейм. За рэвалюцыйную дзейнасць арыштаваны польскімі ўладамі, у 1930 годзе асуджаны, вызвалены ў 1932-м у выніку абмену палітвязнямі. Працаваў у камісіі АН Беларусі па вывучэнні Заходняй Беларусі. Аўтар вершаў, публіцыстычных твораў. У 1927 годзе выдаў у Вільні «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 г.)» для сярэдніх школ, якая выканала вялікую ролю ў навучанні і патрыятычным выхаванні. Пераклаў на беларускую мову паэму А. Блока «Дванаццаць». У 1933 годзе рэпрэсіраваны, у 1937 годзе расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

1933 год — нарадзіўся (вёска Востранка Жыткавіцкага раёна) Мікалай Адамавіч Ярмаш, беларускі вучоны ў галіне тэхнічнай кібернетыкі, аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм (АІС), доктар тэхнічных навук, прафесар, вынаходнік СССР. Аўтар работ па метадах стварэння АІС, іх праграмна-інфармацыйным забеспячэнні для машынабудаўнічага праектавання, а таксама апаратных сродках для ЭВМ і апрацоўкі галаграм, лічбавых малюнкаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2004 годзе.

У свеце

1837 год — нарадзіўся Іван Мікалаевіч Крамской, рускі жывапісец і мастацкі крытык, адзін з заснавальнікаў Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. Аўтар знакамітых карцін «Невядомая», «Хрыстос у пустыні» і іншых. Памёр у 1887 годзе.

1903 год — нарадзілася Маргерыт Юрсенар, французская пісьменніца, першая жанчына, якая стала членам Французскай акадэміі. Аўтар вострасюжэтнай філасофскай прозы (раманаў «Мемуары Адрыяна», «Чорная магія», «Філасофскі камень», п'ес, апавяданняў). Памерла ў 1987 годзе.

1910 год — нарадзіўся Роберт Шуман, нямецкі кампазітар і музычны крытык. Адзін з самых значных кампазітараў першай паловы XIX стагоддзя. У сваёй музыцы адлюстраваў глыбока асобасную прыроду Рамантызму. Аўтар цыклаў фартэпіянных п'ес лірыка-драматычнага, выяўленчага і «партрэтнага» жанраў, звязаных паміж сабой унутранай сюжэтна-псіхалагічнай лініяй, сярод якіх «Карнавал», «Матылькі» і інш. У вакальнай творчасці Шуман развіваў тып лірычнай песні. Найбольш папулярны з вакальных цыклаў — «Каханне паэта» на вершы Г. Гейнэ, «Каханне і жыццё жанчыны». Памёр у 1856 годзе.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2203. Нумар падпісаны ў 19.30 7 чэрвеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12